Выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь
НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

30 мая 2025 года

Мінскі абласны аграфорум прайшоў у Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце. Яго ўдзельнікамі сталі навучэнцы агракласаў Міншчыны.

# Пяць крокаў да якасці

— Мэта форуму — павышэнне кампетэнтнасці педагогаў, якія выкладаюць факультатыўныя заняткі "Уводзіны ў аграрныя прафесіі", забеспячэнне ўмоў для прафесійнай арыентацыі навучэнцаў да працягу адукацыі па аграрных спецыяльнасцях у сістэме бесперапыннай аграрнай адукацыі ў профільных УВА, актывізацыя і стымуляванне цікавасці навучэнцаў да дзейнасці аграпрамысловага комплексу, — адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Мікалай Башко.

Сёння ў Мінскай вобласці сфарміравана больш як 160 класаў аграрнай накіраванасці, у якіх займаюцца больш за 1000 школьнікаў.

— Абласны аграрны форум — пацвярджэнне таго, што будучыня за таленавітымі і мэтанакіраванымі спецыялістамі, — упэўнены Мікалай Мікалаевіч. — Каб праводзіць заняткі, трэба быць у трэндзе і валодаць сучаснымі тэхналогіямі. Таму без навучання мы не дасягнём неабходнага выніку. Усе аграрныя класы вобласці замацаваны за сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі. Не на паперы, а ў рэальнасці яны працуюць з сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі.

Завяршыўся форум адкрытым мікрафонам, падчас якога былі абмеркаваны пытанні павышэння прэстыжу спецыяльнасцей для аграпрамысловага комплексу, рэгіянальныя аспекты функцыянавання профільных класаў аграрнай накіраванасці, магчымасці і перспектывы навучання ў іх.

**Наталля САХНО.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**